НАЦЫЯНАЛЬНАЯ АКАДЭМІЯ НАВУК БЕЛАРУСІ
ЦЭНТР ДАСЛЕДАВАННЯЎ БЕЛАРУСКАЙ КУЛЬТУРЫ, МОВЫ І ЛІТАРАТУРЫ НАН БЕЛАРУСІ

Аб’ект аўтарскага права

УДК 821.161.3

**КОСЦІНА**
**Жанна Вячаславаўна**

# ЭСТЭТЫЧНЫ ІДЭАЛ ЛІТАРАТУРЫ БЕЛАРУСІ ПЕРШАЙ ПАЛОВЫ XIX СТАГОДДЗЯ

Дысертацыя на атрыманне вучонай ступені
кандыдата філалагічных навук
па спецыяльнасці 10.01.01 – беларуская літаратура

Мінск, 2024

Навуковая работа выканана ў філіяле “Інстытут літаратуразнаўства імя Янкі Купалы” ДНУ “Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі”

| | |
|---|---|
| Навуковы кіраўнік | **Саверчанка Іван Васільевіч,** доктар філалагічных навук, прафесар, дырэктар філіяла “Інстытут літаратуразнаўства імя Янкі Купалы” ДНУ “Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі” |
| Афіцыйныя апаненты: | **Мельнікава Зоя Пятроўна,** доктар філалагічных навук, прафесар, прафесар кафедры беларускага і рускага літаратуразнаўства і журналістыкі УА “Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А.С. Пушкіна”<br><br>**Бурдзялёва Ірына Аляксееўна,** кандыдат філалагічных навук, дацэнт, дацэнт кафедры беларускай філалогіі і замежнай літаратуры УА “Мінскі дзяржаўны лінгвістычны ўніверсітэт” |
| Апаніруючая арганізацыя | **УА “Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя МаксімаТанка”** |

Абарона адбудзецца «29» студзеня 2025 года ў 14.00 гадзін на пасяджэнні савета па абароне дысертацый Д 01.42.04 пры ДНУ “Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі” (220072, г. Мінск, вул. Сурганава, д. 1, корп. 2; e-mail: iml@belcentre.by; тэлефон вучонага сакратара +375296544446).

З дысертацыяй можна азнаёміцца ў Цэнтральнай навуковай бібліятэцы імя Якуба Коласа Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі (220072, г. Мінск, вул. Сурганава, д. 15).

Аўтарэферат разасланы «21» снежня 2024г.

Вучоны сакратар савета
па абароне дысертацый
кандыдат філалагічных навук, дацэнт А. І. Богдан

# УВОДЗІНЫ

Сучаснае літаратуразнаўства звяртаецца да тэорый, катэгорый, фактаў іншых гуманітарных дысцыплін. Гэта тлумачыцца тым, што мастацтва слова не абыходзіць тэм, з'яў, праблем, якія даследуюцца філасофіяй, эстэтыкай, культуралогіяй, гісторыяй, сацыялогіяй, псіхалогіяй, этнаграфіяй, этыкай, семіётыкай. Прырода, грамадскія адносіны, нацыянальная ідэнтычнасць, характар чалавека з'яўляюцца зместам літаратурнай творчасці, якая разглядаецца літаратуразнаўствам. Асноўнай катэгорыяй даследавання мастацкага твора з'яўляецца эстэтычны ідэал.

Пытанне эстэтычнага ідэалу даўно прыцягвала ўвагу даследчыкаў як у тэарэтычным, так і метадалагічным плане. У апошнім выпадку неабходна падкрэсліць, што ён прадстаўляе пэўны прынцып даследавання мастацкага твора, скіроўвае на пазнанне ў творчасці індывідуальна-непаўторнага і гістарычна-тыпалагічнага.

Эстэтычны ідэал служыць інтэгратарам каштоўнасных арыентацый культуры. Ён вызначаецца ў філасофскіх працах як уяўленне аб пажаданай, неабходнай, дасканалай эстэтычнай каштоўнасці і з'яўляецца крытэрыем і мэтай пазнавальнай і практычна-пераўтваральнай дзейнасці асобы. Адзначаецца, што ў эстэтычных каштоўнасцях «апрадмечана развіццё свабоды чалавека і грамадства»[1]. Разважаючы пра ідэалы мастака і мастацкую творчасць, Г. М. Паспелаў апасродкавана абазначыў эстэтычны ідэал як «ідэйныя перакананні» аўтара твора; без іх «мастак аказваецца малаздольным распазнаць істотнае і заканамернае ў індывідуальным і выпадковым і больш цікавіцца знешнімі адносінамі і здарэннямі жыцця, чым глыбіннымі асаблівасцямі і працэсамі»[2].

Даная катэгорыя эстэтыкі і літаратуразнаўства актуалізавалася ў сувязі з агульнымі зменамі ў Беларусі, узмоцненымі пошукамі грамадскіх, сацыяльных і мастацкіх ідэалаў. Ёсць своеасаблівая заканамернасць, што ў 50-90-я гады XX стагоддзя ўзрасла цікавасць да праблемы ідэалу, сведчаннем чаго стала вялікая колькасць твораў з маральна-філасофскай праблематыкай, а таксама даследаванняў на гэтую тэму. Адначасова ўзмацнілася цікавасць айчынных літаратуразнаўцаў да мастацтва слова XIX стагоддзя, актывізавалася перакладчыцкая дзейнасць. Гэтая тэндэнцыя працягваецца і ў XXI стагоддзі. На пачатку 2000-х гадоў сцвердзілася выснова, што вытокі сучаснай нацыянальнай літаратуры знаходзяцца ў XIX стагоддзі.

---

[1]Столович, Л. Н. Природа эстетической ценности / Л. Н. Столович. – М. : Политиздат, 1972. – С. 224.

[2]Поспелов, Г. Н. Искусство и эстетика / Г. Н. Поспелов. – М. : Искусство, 1984. – С.181.

Актуальнасць даследавання абумоўлена ўзрастаючай цікавасцю да літаратуры Беларусі XIX стагоддзя, што тлумачыцца жаданнем акрэсліць нацыянальныя каштоўнасці, якія аформіліся ў шматмоўным слоўна-мастацкім матэрыяле. У XIX стагоддзі адбываліся змены самага living розстага парадку, якія былі б немагчымымі без натхняльнага вобраза пажаданага, без ідэалу, народжанага самой рэчаіснасцю. Ідэал быў не ўтапічны, а дакладны ў сваіх абрысах. Ён выказваўся самабытнай, арыгінальнай творчай асобай, якая хутка засвойвала прынцыпы новай мастацкай праграмы, звязанай з эстэтыкай і філасофіяй культуры еўрапейскага кантынента ў канцы XVIII – першай паловы XIX стагоддзя. Расчараванне ў выніках Вялікай французскай рэвалюцыі выклікала іранічнае стаўленне да гісторыі, што прадвызначыла з’яўленне прынцыпу рамантычнай іроніі ў філасофскім і мастацкім матэрыяле. Гэты эстэтычны прынцып абумовіў ідэйны змест і кампазіцыйнае афармленне літаратурнага твора першай паловы XIX стагоддзя ў Беларусі. У навуковай айчыннай літаратуры адсутнічае асэнсаванне творчасці пісьменнікаў праз выяўленне прысутнасці рамантычнай іроніі ў мастацкіх тэкстах.

Застаецца актуальнай у сучасным літаратуразнаўстве праблема духоўна-рэлігійнага ўплыву на творчасць пісьменнікаў першай паловы XIX стагоддзя. Пацверджаннем таму служаць працы А. С. Яскевіча, У. І. Мархеля, І. Э. Багдановіч. Даследаванне хрысціянскіх матываў у творчасці Я. Чачота, В. Дуніна-Марцінкевіча, У. Сыракомлі, В. Каратынскага сведчыць не толькі аб унікальным тыпе мыслення пісьменнікаў, але і яшчэ аб адным аспекце эстэтычнага ідэалу новай беларускай літаратуры. Філасофія хрысціянства прапаведавала цярпімасць, самаахвярнасць, любоў да бліжняга, пакаянне, якія становяцца асноўнымі матывамі ў айчынным мастацтве слова.

Перыяд канца XVIII – першай паловы XIX стагоддзя стаў часам фарміравання нацый. Таму ў літаратуры з’явілася гістарычная тэма, якая сведчыла аб выкрышталізацыі ідэнтычнасці, жаданні захаваць нацыянальную самабытнасць. Пісьменнікі Ю. У. Нямцэвіч, Я. Ходзька, А. Петрашкевіч, Т. Зан, Я. Чачот, А. Міцкевіч, Т. Лада-Заблоцкі, У. Сыракомля, В. Каратынскі, В. Дунін-Марцінкевіч, Ю. І. Крашэўскі featured рознабакова адлюстроўвалі мінулае ў сваіх творах. Праблема гістарызму, пастаўленая і развітая ў літаратурнай барацьбе рамантыкаў і класіцыстаў, вылілася ў мастацкіх творах не толькі ва ўзнаўленні так званага мясцовага каларыту (ад франц. *couleur locale*), але і ў адлюстраванні «духу часу» – духу розных эпох і нацыянальных культур, пад якімі рамантыкі разумелі асаблівасці нацыянальнага ўкладу жыцця, вераванняў, абрадаў і паводзін людзей.

Гісторыка-патрыятычная тэма становіцца найважнейшай у літаратуры Беларусі першай паловы XIX стагоддзя.

Актуальным і запатрабаваным складнікам у даследаванні эстэтычнага ідэалу вызначанага перыяду з'яўляюцца вобразы шляхціца і селяніна, а таксама паэта. Шляхціц і селянін выступаюць асноўнымі персанажамі новай беларускай літаратуры, бо непасрэдна звязаны з нацыянальнымі ўяўленнямі аб маральна-эстэтычнай канцэпцыі чалавечага існавання. Героі твораў А. Міцкевіча, Я. Баршчэўскага, В. Каратынскага, У. Сыракомлі і В. Дуніна-Марцінкевіча, паэмы «Тарас на Парнасе» імкнуцца да невыяўнічасці і згоды, прыяўляюць кемлівасць і цвярозыя адносіны да справы, адказнае стаўленне да жыцця.

У эстэтыцы рамантызму вобраз мастака і творцы займае цэнтральнае месца. Рамантыкі супрацьпаставілі Ідэал – Рэчаіснасць, яны ўзносілі жыццё духу над штодзённай рэальнасцю, сцвярджалі мастацтва галоўным спосабам пазнання вышэйшых ісцін, а паэтаў – прарокамі і лідарамі чалавецтва. «Мастак з дапамогай геніяльнай інтуіцыі лепш разумее рэчаіснасць»[3]. Лірычны герой паэзіі Беларусі першай паловы XIX стагоддзя ўвасабляецца ў вобразе выгнанніка, які праз прастору і час пастаянна вяртаецца да месца нараджэння, да калыскі сваёй ідэнтычнасці.

Значным у выяўленні эстэтычнага ідэалу літаратуры Беларусі першай паловы XIX стагоддзя з'яўляецца прэрагатыва эмоцыі ў змесце мастацкіх твораў. Яна стала адным з найважнейшых прадметаў філасофскіх пошукаў у літаратурна-крытычных працах Э. Канта, Ё. Фіхтэ, Ф. Шлегеля, Наваліса. Ацэнка падзей, учынкаў герояў, абставін у паэзіі заўсёды эмацыянальная. Таму неабходна вызначыць дамінуючыя эмоцыі ў літаратуры Беларусі данага перыяду, каб акрэсліць цэласны пафасна-экспрэсіўны фон слоўнага мастацтва.

Катэгорыя эстэтычнага ідэалу ў літаратурных творах рэалізуецца праз слова. Найбольшую каштоўнасную вагу слова мае ў лірыцы, якая дамінавала ў літаратуры рамантызму. «Паэтычнасць слова цяпер не забяспечвалася векавымі навыкамі, не прыходзіла гатовай з устойлівай стылістычнай сістэмы; яе спараджае кантэкст. Паэт стаяў цяпер перад цяжкай задачай пераўтварэння "дзікага" слова ў новы "нервовы вузел" імгнення ўзніклых і беспамылкова дзейнічаючых асацыяцый»[4]. У літаратуры Беларусі першай паловы XIX стагоддзя быў акрэслены шэраг слоў-знакаў, слоў-сігналаў

---

[3]Соллертинский, И. И. Романтизм, его общая и музыкальная эстетика / И. И. Соллертинский.– Л : Знание, 1956. –С. 57.

[4] Гинзбург, Л. Я. О лирике / Л. Я. Гинзбург. – М. : Интрада, 1997. – С. 17.

(тэрміны В. А. Гофмана[5]), якія вызначылі нацыянальную семіятычную сістэму, што знайшла сваё ўвасабленне ў айчыннай літаратурнай традыцыі.

Для тлумачэння эстэтычнага ідэалу літаратуры Беларусі данага перыяду важна выявіць дамінуючыя жанры слоўнага мастацтва, бо форма мастацкага твора з'яўляецца адной з ягоных характарыстык.

Вывучэнне структуры эстэтычнага ідэалу літаратуры Беларусі першай паловы XIX стагоддзя дасць магчымасць вызначыць ідэйна-мастацкія выток новай беларускай літаратуры.

## АГУЛЬНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА РАБОТЫ

**Сувязь работы з навуковымі праграмамі (праектамі), тэмамі.** Дысертацыя выканана ў сектары гісторыі беларускай літаратуры Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі ў межах ДПНД «Эканоміка і гуманітарнае развіццё беларускага грамадства» (падпраграма «Беларуская мова і літаратура») на 2016 – 2020 гг.; заданне «Герменеўтыка і фенаменалогія беларускай літаратуры», падзаданне «Герменеўтыка беларускай літаратуры XI–XX стст.»; заданне «Літаратурныя эпохі, перыяды і стылі ў беларускай літаратуры: X – пачатак XXI ст.» на 2021 – 2025 гг.

**Мэта і задачы даследавання. Мэта:** асэнсаваць літаратуру Беларусі першай паловы XIX стагоддзя ў аспекце вызначэння і апісання спецыфікі выяўлення эстэтычнага ідэалу ў творчасці пісьменнікаў.

**Задачы,** якія неабходна вырашыць для дасягнення пастаўленай мэты:

1) сістэматызаваць навуковыя канцэпцыі замежных і айчынных даследчыкаў пра эстэтычны ідэал з мэтай удакладніць найбольш важныя змястоўна-фармальныя складальнікі данай катэгорыі;

2) адзначыць спецыфічныя праявы рамантычнай іроніі як эстэтычнага прынцыпу літаратуры Беларусі першай паловы XIX стагоддзя;

3) выявіць спосабы рэпрэзентацыі эстэтычнага ідэалу літаратуры Беларусі першай паловы XIX стагоддзя на розных узроўнях мастацкага твора;

4) вызначыць эстэтычныя каштоўнасці ў мастацкіх творах Беларусі першай паловы XIX стагоддзя.

**Аб'ект і прадмет даследавання.** *Аб'ект* дысертацыйнага даследавання – мастацкія творы, дакументалістыка, крытычныя працы літаратуры Беларусі першай паловы XIX стагоддзя (Ю. У. Нямцэвіча,

[5]Гофман, В. А. Язык литературы: Очерки и этюды / В. А. Гофман. – Л :Гослитиздат, 2 тип Трансжелдориздата, 1936. – 381 с.

А. Міцкевіча, Я. Ходзькі, А. Гарэцкага, Я. Чачота, Т. Зана, У. Сыракомлі, В. Каратынскага, В. Дуніна-Марцінкевіча, І. Ходзькі, Т. Лады-Заблоцкага, Ю. І. Крашэўскага і інш.). *Прадмет* даследавання – канцэптуальны ўзровень, мастацкі свет, стылістычныя характарыстыкі твораў літаратуры Беларусі першай паловы XIX стагоддзя.

**Метадалагічная база.** Метадалагічная асаблівасць нашай работы заключаецца ў спробе злучыць тэарэтыка-літаратурны і агульнаэстэтычны падыходы з элементамі параўнальнага (гістарычнага і тыпалагічнага) літаратуразнаўства і культуралогіі. Мы звяртаемся да тэорыі эстэтычнага ідэалу (А. Ф. Лосеў, В. П. Шастакоў, Ю. Б. Бораў), тэорыі сімвала ў літаратуры (А. Ф. Лосеў, С. С. Аверынцаў), тэарэтычных палажэнняў аксіялагічнага падыходу ў літаратуразнаўстве (Л. Н. Сталовіч, М. С. Каган), семіётыкі (Ю. М. Лотман), структуралізму.

**Навуковая навізна атрыманых вынікаў** заключаецца ў:

– грунтоўным даследаванні эстэтычнага ідэалу літаратуры Беларусі першай паловы XIX стагоддзя з улікам канцэптуальнага ўзроўню, мастацкага свету, знешняй формы мастацкага твора;

– вызначэнні ролі рамантычнай іроніі, якая прадстаўлена як тып мастацкага мыслення і аснова кампазіцыйнай будовы мастацкага твора ў часы рамантызму;

– абгрунтаванні месца духоўна-хрысціянскіх матываў, гісторыка-патрыятычнай тэматыкі, эмоцыі як змястоўнага элемента, вобразаў-сімвалаў кветкі, ракі, кургана ў творах даследуемага перыяду;

– вылучэнні дамінуючых форм і жанраў літаратуры Беларусі першай паловы XIX стагоддзя як стылістычных характарыстык эстэтычнага ідэалу.

**Палажэнні, якія выносяцца на абарону**

1. Эстэтычны ідэал як асноўная катэгорыя даследуецца ў філасофіі, эстэтыцы, мастацтвазнаўстве, літаратуразнаўстве. Расійскія навукоўцы А. Ф. Лосеў і В. П. Шастакоў, характарызуючы эстэтычныя катэгорыі, назвалі ідэал сінтэзам уяўленняў аб рэчаіснасці і ідэі, якая адлюстроўвае яе. Эстэтычны ідэал утрымлівае ў сабе ідэю прыгожага, якая звязана з усімі эстэтычнымі катэгорыямі, размеркаванымі даследчыкамі ў тры групы. Кожная з гэтых груп адпавядае ўзроўням раскрыцця эстэтычнага ідэалу – канцэптуальнаму; узроўню арганізацыі твора як мастацкага цэлага; узроўням “унутранай” формы, знешняй формы літаратурнага твора. Аналіз навуковага набытку другой паловы XX стагоддзя прывёў да неабходнасці ўліку нацыянальнай спецыфікі літаратуры ў эпоху, калі актуалізуюцца сацыяльна-гістарычныя ўмовы жыцця пэўнага народа. Эстэтычны ідэал польскамоўных аўтараў Беларусі першай паловы XIX стагоддзя аналізаваўся ў жанрах

крытычных артыкулаў, дакументальных нарысаў і нататак шляхам выяўлення прынцыпу народнасці.

2. Эстэтычны ідэал літаратуры Беларусі першай паловы XIX стагоддзя выявіўся ў катэгорыі іроніі. Іронія ў рамантызме мае сваю спецыфіку, якую вызначылі нямецкія філосафы Ё. Г. Фіхтэ, Ф. Шлегель, Г. В. Ф. Гегель. Рамантычная іронія выявілася як несупадзенне ідэальнай мадэлі свету і рэальнага выніку яе рэалізацыі, а таксама ў паказе зменлівай, супярэчлівай прыроды чалавека. Прынцып рамантычнай іроніі дамінуе ў паэмах «Энеіда навыварат», «Тарас на Парнасе», у творах Г. Жавускага «Успаміны Сапліцы», Я. Баршчэўскага, у беларускай аповесці Г. Мастоўскай «Не заўсёды так робіцца, як гаворыцца». Даны тып эстэтычнай ацэнкі выявіўся ў апісанні дзейнасці прадстаўнікоў беларускай шляхты, сімвалізацыі духоўнага стану грамадства і суб’екта апошняга. Кампазіцыя твораў і вобразаў літаратуры Беларусі першай паловы XIX стагоддзя будавалася пад уплывам рамантычнай іроніі і гофманаўскай «двухсветавасці».

3. Даследаванне эстэтычнага ідэалу літаратуры Беларусі першай паловы XIX стагоддзя ажыццяўляецца шляхам аналізу канцэптуальнага ўзроўню і мастацкага свету твораў, дзе значнае месца займаюць хрысціянскія матывы. Важны элемент у масіве народнай культуры – хрысціянскія дабрачыннасці любові, цноты, пакаяння – па-мастацку ўвасоблены ў творах Я. Аноўкі, Я. Чачота, У. Сыракомлі, В. Каратынскага, Я. Баршчэўскага, В. Дуніна-Марцінкевіча.

У літаратуры першай паловы XIX стагоддзя пачынае набываць значнасць тэма гісторыі Краю, якая, аднак, не адразу робіцца эстэтычнай каштоўнасцю. Г. Мастоўская стварыла першы «ліцвінскі» псеўдагістарычны раман, адаптаваўшы гатычны твор да хранатопу былой Рэчы Паспалітай. Патрыятычныя матывы і вобраз патрыёта становяцца дамінуючымі ў паэзіі Ю. У. Нямцэвіча, Я. Ходзькі, А. Петрашкевіча, Т. Зана, Я. Чачота, А. Міцкевіча, Т. Лады-Заблоцкага, У. Сыракомлі, В. Каратынскага, В. Дуніна-Марцінкевіча. Дадатковую магчымасць для навуковага аналізу эстэтычнага ідэалу даюць улучаныя ў абсяг даследавання публіцыстычныя тэксты з уласцівымі ім сродкамі рэпрэзентацыі патрыятычнай ідэі. Пісьменнікі Беларусі першай паловы XIX стагоддзя стварылі сваю тыпалогію літаратурных герояў, якія ў дадзены перыяд прадстаўлены пераважна ў сацыяльных ролях. Селянін, шляхціц з’яўляюцца носьбітамі гістарычнай памяці, уяўленняў аб справядлівасці. Феномен творчай асобы – паэта – прыцягвае ўвагу Я. Аношкі, У. Сыракомлі, В. Каратынскага, В. Дуніна-Марцінкевіча. Дамінуючай у літаратуры рамантызму становіцца тэма выгнанніцтва і звязаны з ёю вобраз героя-пілігрыма.

Пачынаючы з сентыменталістаў, базавае значэнне ў мастацкім адлюстраванні жыцця набывае эмоцыя. Літаратурна-мастацкая канцэпцыя эстэтычнага ідэалу літаратуры Беларусі першай паловы XIX стагоддзя дапамагае растлумачыць светапогляд творчай асобы, якая акумулюе ў сабе і транслюе свету перажыванні і эмоцыі. Дамінуючымі ў айчыннай літаратуры даследаванага перыяду выступаюць дзве супрацьлеглыя эмоцыі – радасць і смутак.

4. Паэты-рамантыкі, раскрываючы свету нацыянальнае быццё, імкнуліся адбіраць такія элементы мастацкай формы, якія ў творах набывалі моц і каштоўнасць. Эстэтычны ідэал літаратуры Беларусі першай паловы XIX стагоддзя знайшоў увасабленне ва ўзорах раслінна-кветкавай сімволікі, вобразах-локусах воднай плыні, кургана. Эстэтычнае значэнне набываюць у творах даследаванага перыяду фальклорныя формы выяўлення пачуццяў і думак, адлюстравання падзей. Гэтым абумоўлена распаўсюджанасць такіх жанраў, як песня ў яе розных мадыфікацыях; балада; навелістычнае апавяданне ў празаічнай і паэтычнай форме; калыханка; казка.

**Асабісты ўклад саіскальніка вучонай ступені ў выніку дысертацыі з абмежаваннем іх ад суаўтараў сумесных даследаванняў і публікацый.** Дысертацыя ўяўляе сабой самастойнае навуковае даследаванне. Публікацыі па тэме работы напісаны без суаўтараў і адлюстроўваюць асабісты ўклад саіскальніка ў аналіз эстэтычнага ідэалу літаратуры Беларусі першай паловы XIX стагоддзя.

**Апрабацыя вынікаў дысертацыі.** Асноўныя палажэнні і вынікі даследавання дакладваліся і абмяркоўваліся: на Міжнароднай навуковай канферэнцыі, прысвечанай 180-годдзю з дня нараджэння польскага і беларускага паэта і этнографа Уладзіслава Сыракомлі (Мінск–Любань, 29–30 верасня 2003 г.); Міжнароднай навуковай-практычнай канферэнцыі «Максім Багдановіч –празаік, крытык, публіцыст» (Мінск, 29 лістапада 2005 г.); Рэспубліканскай навуковай канферэнцыі «Вінцэсь Каратынскі ў беларуска-славянскім літаратурным узаемадзеянні (Мінск, 29 верасня 2006 г.); III Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі «Міжнародныя Шамякінскія чытанні “Пісьменнік – Асоба – Час” (Мазыр, 27 верасня 2013 г.); XXVI Гарэцкіх чытаннях «Максім і Гаўрыла Гарэцкія. Жыццё і творчасць (прысвячаецца 125-годдзю Максіма Гарэцкага» (Мінск, 19 красавіка 2018 г.); V Международной научно-практической конференции «GLOBAL SCIENCE AND INNOVATIONS 2019 : CENTRAL ASIA» (Астана, 9 – 13 апреля 2019 г.); Международной научной конференции «Славянский мир: духовные традиции и словестность» (Тамбов, 23 – 25 мая 2019 г.); XXVII Гарэцкіх чытаннях «Максім і Гаўрыла Гарэцкія. Жыццё і творчасць

(прысвячаецца 100-годдзю выхаду ў свет аповесці “Дзве душы” і 90-годдзю афіцыйнага надання Гаўрылу Гарэцкаму звання акадэміка Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі» (Мінск, 14 чэрвеня 2019 г.); III Научно-практическом столе в рамках реализации цикла «Цифровой конгресс-2020» (Барановичи, 13 марта 2020 г.); IX Международной научно-практической конференции «GLOBAL SCIENCE AND INNOVATIONS 2020 : CENTRAL ASIA» (Астана, 20 июня 2020 г.); Международной научно-практической конференции «Искусство слова в диалоге культур: проблемы компаративистики» (Брест, 12-13 марта 2020 г.); I Международной научно-практической конференции «Наука – практике» (Барановичи, 15 мая 2020 г.); Международной научной конференции «Романовские чтения – 15» (Могилев, 26-27 ноября 2020 г.); IV Научно-практическом столе в рамках реализации цикла «Цифровой конгресс-2020» (Барановичи, 13 марта 2020 г.); XI міжнародної науково-практицної інтернет-конференції «Глухівські читання – 2021» (Глухів, 8-9 грудня 2021); II Міжнародным форуме даследчыкаў беларускай казкі «Казка ў еўрапейскай прасторы 2» (Мінск, 27-29 мая 2021 г.); XXIX Гарэцкіх чытаннях «Максім і Гаўрыла Гарэцкія. Жыццё і творчасць (прысвячаецца 100-годдзю з дня нараджэння Галіны Максімаўны Гарэцкай і 55-годдзю вяртання ў Беларусь Гаўрылы Іванавіча Гарэцкага» (Мінск, 30 чэрвеня 2021 г.); II Кісялёўскіх чытаннях «Да 200-годдзя рамантызму ў літаратуры Беларусі» (Мінск, 22 красавіка 2022 г.); XXIX Гарэцкіх чытаннях «Максім і Гаўрыла Гарэцкія. Жыццё і творчасць (прысвячаецца 100-годдзю з дня нараджэння Галіны Максімаўны Гарэцкай і 55-годдзю вяртання ў Беларусь Гаўрылы Іванавіча Гарэцкага» (Мінск, 30 чэрвеня 2021 г.); III Международной научно-практической конференции «Наука – практике» (Барановичи, 19 мая 2022 г.); Трынаццатых Танкаўскіх чытаннях (Мінск, 16 верасня 2022 г.); VIII Міжнароднай навуковай канферэнцыі «Шамякінскія чытанні: «Пісьменнік – Асоба – Час» (Мазыр, 18–19 красавіка 2024 г.).

**Апублікаванасць вынікаў дысертацыі.** Матэрыялы даследавання адлюстраваны ў 28 публікацыях: 8 артыкулаў у навуковых часопісах, рэкамендаваных ВАК (3,56 аўт. арк.), 4 у зборніках навуковых артыкулаў (1,31 аўт. арк.), 16 – матэрыялы навуковых канферэнцый (4,11 аўт. арк.). Агульны аб’ём апублікаваных матэрыялаў складае 8,98 аўтарскіх аркушаў.

**Структура і аб’ём дысертацыі.** Дысертацыйнае даследаванне складаецца з уводзін, агульнай характарыстыкі работы, 4 глаў, заключэння, бібліяграфічнага спіса (194 назвы, з іх 166 – спіс выкарыстаных крыніц, 28 – публікацыі саіскальніка). Аб’ём даследавання – 115 старонак, са спісам літаратуры – 129 старонак.

# АСНОЎНАЯ ЧАСТКА

Глава 1 **«Аналітычны агляд літаратуры па тэме даследавання»** прысвечана разгляду пытання эстэтычнага ідэалу ў еўрапейскіх і айчынных філасофскіх і літаратуразнаўчых крыніцах.

У раздзеле 1.1 **«Эстэтычны ідэал як аб'ект даследавання гуманітарных дысцыплін»** праводзіцца агляд прац, у якіх эстэтычны ідэал як асноўная катэгорыя даследуецца расійскімі і польскімі навукоўцамі А. Ф. Лосевым, В. П. Шастаковым, М. С. Каганам, Л. Н. Сталовічам, А. С. Мігуновым, А. Кучыньскай, Ю. Б. Боравым, М. К. Геем, В. М. Піскуновым, С. С. Аверынцавым, Г. М. Паспелавым, Ю. Г. Нігматулінай.

Навуковыя пазіцыі філосафаў і эстэтыкаў А. Ф. Лосева і В. П. Шастакова, выкладзеныя ў манаграфіі «Гісторыя эстэтычных катэгорый» (1965), грунтуюцца на тым, што эстэтычны ідэал утрымлівае ў сабе ідэю прыгожага. Ідэя прыгожага звязана з усімі эстэтычнымі катэгорыямі, размеркаванымі даследчыкамі ў тры групы. Кожная з гэтых груп адпавядае ўзроўням раскрыцця эстэтычнага ідэалу – канцэптуальнаму, узроўню арганізацыі твора як мастацкага цэлага, узроўням "унутранай" формы, знешняй формы літаратурнага твора. Аналіз філасофскіх канцэпцый, ажыццяўлёны ў даследаванні М. С. Кагана, Л. Н. Сталовіча, А. С. Мігунова, А. Кучыньскай, Ю. Б. Борава, дазваляе гаварыць аб тым, што эстэтычны ідэал разумеецца шматгранна, а іменна як: канкрэтна-эмацыянальнае ўяўленне аб прыгожым; эмацыянальна-афарбаваны вобраз дасканаласці; уяўленне аб вышэйшай эстэтычнай каштоўнасці.

У савецкім літаратуразнаўстве, пачынаючы з 60-х гадоў XX стагоддзя, з'явіліся работы, якія непасрэдна імкнуліся выявіць значнасць эстэтычнага ідэалу для аналізу твораў мастацкай літаратуры. Гэта кнігі М. К. Гея і В. М. Піскунова «Эстэтычны ідэал савецкай літаратуры», Я. С. Громава «Эстэтычны ідэал», А. У. Ларміна «Эстэтычны ідэал і сучаснасць», А. К. Дрэмава «Ідэал і герой». Ю. Г. Нігматуліна ў працы «Нацыянальная своеасаблівасць эстэтычнага ідэалу» прыйшла да неабходнасці ўліку нацыянальнай спецыфікі літаратуры.

У раздзеле 1.2 **«Эстэтычны ідэал у літаратуразнаўчай думцы Беларусі»** ўвага звернута на крытычныя артыкулы, дакументальныя нарысы і нататкі, у якіх былі прадстаўлены ацэнкі твораў літаратараў Беларусі першай паловы XIX стагоддзя. Адзначаецца, што А. Міцкевіч, Я. Чачот, А. Рыпінскі цанілі праўдападобнасць, блізкасць да фальклорнага

першатэксту; Р. Падбярэскі бачыў «гофманізм» у творах Я. Баршчэўскага; У. Сыракомля, В. Каратынскі абаранялі нованароджаную літаратуру на беларускай мове, якая станавілася для іх эстэтычнай каштоўнасцю.

Канстатуецца, што прадстаўнікі беларускай даследчыцкай думкі пачатку ХХ стагоддзя недаацэньвалі творчасць польскамоўных пісьменнікаў. Але М. Багдановіч, М. Гарэцкі адзначалі ў паэтаў «народны дух» літаратуры. Аўтар першай «Гісторыі беларускае літаратуры» высока ацэньваў дзейнасць навуковых і творчых сіл, сканцэнтраваных у Віленскім універсітэце, бо маладыя паэты змаглі адлюстраваць мінуўшчыну беларускага народа.

У беларускай літаратуразнаўчай думцы, пачынаючы з сярэдзіны ХХ стагоддзя і па сённяшні момант, назіраецца тэндэнцыя разглядаць мастацкія творы з пазіцый выяўлення эстэтычнага ідэалу, а таксама аналізуюцца перакладзеныя польскамоўныя тэксты. Асобныя навуковыя даследаванні І. Э. Багдановіч, А. С. Яскевіча, У. М. Конана, І. Бурдзялёвай, С. Мінскевіча, І. В. Саверчанкі выяўляюць і характарызуюць пэўныя элементы, якія складаюць эстэтычны ідэал літаратуры Беларусі першай паловы ХІХ стагоддзя: хрысціянскія каштоўнасці, нюансы паэтыкі, формы мастацкіх твораў.

Глава 2 **«Рамантычная іронія як асноўны эстэтычны прынцып літаратуры Беларусі першай паловы ХІХ стагоддзя»** ўяўляе аналіз твораў, зыходзячы з прынцыпу рамантычнай іроніі.

У раздзеле 2.1 **«Рамантычная іронія як тып мастацкага мыслення ў літаратуры Беларусі першай паловы ХІХ стагоддзя»** сцвярджаецца ідэя, што рамантычная іронія рэалізоўвалася ў псеўдападыходе да гісторыі, кантрасным уяўленні пра сярэднявечнага рыцара і сучаснага маладога шляхціца ў аповесці «Не заўсёды так робіцца, як гаворыцца» Г. Мастоўскай. Сатырычны пафас як сродак выкрыцця дзейнасці дзяржаўнай эліты ва «Успамінах Сапліцы» Г. Жавускага, «Успамінах квестара» І. Ходзькі, у «Аповесці з майго часу, альбо Літоўскія прыгоды» І. Яцкоўскага прызначаны для рэалізацыі аўтарскай іроніі.

Рамантычная іроніяў аповесці Я. Баршчэўскага «Шляхціц Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях» разглядалася на прыкладзе аналізу вобразаў шляхціца Завальні, Сына Буры і Чорнага ката, у якіх праявілася «двухсветавасць» як асаблівасцьт мастацкага свету аўтара.

Рамантычная іронія як эстэтычны прынцып беларускага рамантызму выявілася ў сінтэзе дзвюх непадобных, супярэчлівых філасофскіх канцэпцый, спароджаных Вялікай французскай рэвалюцыяй – нямецкай і англійскай, што адзначыў А. Міцкевіч у артыкуле «Гётэ і Байран».

У раздзеле 2.2 **«Рамантычная іронія як аснова кампазіцыйнай будовы твора»** разглядаюцца бурлескна-травесційныя паэмы «Энеіда навыварат» і «Тарас на Парнасе», паэзія А. Міцкевіча і Я. Чачота, актуалізуецца ўвага на неадпаведнасці формы і зместу даных твораў, калі высокія жанры паэзіі напаўняюцца карцінамі штодзённасці, апісаннем жыцця прадстаўнікоў нізкіх сацыяльных станаў. Такім чынам узвышаюцца сяляне і засцянковая шляхта, шчырыя сяброўскія адносіны, дзяцінства да ўзораў паэзіі. Кампазіцыя кнігі «Шляхціц Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях» Я. Баршчэўскага выступае як ілюстрацыя традыцыі гофманаўскай іроніі, бо нагадвае кампазіцыю кнігі Э. Т. А. Гофмана «Серапіёнавы браты», калі героі слухаюць апавяданні сяброў, знаёмых і рэфлексуюць думкі, у якіх ацэньваюцца ўчынкі людзей.

Глава 3 **«Рэпрэзентацыя эстэтычнага ідэалу на розных узроўнях мастацкага твора»** прысвечана даследаванню спосабаў рэпрэзентацыі эстэтычнага ідэалу на канцэптуальным узроўні і ў мастацкім свеце літаратурнага твора.

У раздзеле 3.1 **«Духоўна-рэлігійныя каштоўнасці ў эстэтычнай канцэпцыі пачынальнікаў»** сцвярджаецца ідэя, што для паэтаў першай паловы XIX стагоддзя характэрны зварот да духоўна-рэлігійнай праблематыкі. Я. Чачот, па-мастацку рэалізуючы асветніцкую мэту выхавання асобы і грамадства, фарміраваў аксіялагічныя арыенціры эстэтычнага ідэалу беларускай літаратуры. Крыніцай прыгожага для Я. Чачота была вусная народная творчасць, бо толькі яна змагла захаваць хрысціянскае разуменне сутнасці прыроды, сацыяльных паводзін асобы. Хрысціянскія дабрачыннасці – любоў, працавітасць, цнота, якія складаюць узор дасканалых сацыяльных узаемаадносін, – становяцца прыярытэтнымі ў ідэйным змесце паэзіі Я. Чачота. У творах В. Каратынскага мае месца матыў пошуку паэтам Бога, гармоніі асабовага ўнутранага свету і веры ў тое, што чалавецтва, кіруючыся маральнымі каштоўнасцямі, здольна знайсці выратаванне. Ідэалам для В. Каратынскага-хрысціяніна з'яўляецца чалавек, які моцна трымаецца роднай зямлі, сваіх каранёў, верыць у лепшую будучыню; асоба, якая адчувае сваю злучанасць з прыродай і здольная на перажыванне сапраўдных пачуццяў, бо нясе ў сваім сэрцы Божы дух і вечную Надзею. Менавіта такі чалавек, зрабіўшы трывалым падмуркам свайго існавання справядлівасць, праўду – гэта значыць Боскія ісціны, – на думку В. Каратынскага, здольны знайсці правільнае выйсце ў любой сітуацыі.

У раздзеле 3.2 **«Гісторыка-патрыятычная тэма ў святле эстэтычнага ідэалу»** падкрэслена, што гісторыка-патрыятычная тэма

становіцца асноўнай у літаратуры Беларусі першай паловы XIX стагоддзя. У творчасці пісьменнікаў-рамантыкаў яскрава адлюстравана гісторыя Вялікага Княства Літоўскага. Найбольш плённым аўтарам, абазнаным у гістарычнай тэме, быў Ю. І. Крашэўскі. У кантэксце рамантычнага светаразумення ён вырашае канфлікт у аповесці «Апошняя са слуцкіх князёў»: смерць маладой княгіні Соф'і з Алелькавічаў нагадвае пра слаўную гісторыю гэтага роду, які бараніў інтарэсы некалі славутай дзяржавы.

Асноўнай эстэтычнай каштоўнасцю, якая дэманстравалася праз вобразна-семантычны рад паэтычных твораў, стаў «грамадзянскі» патрыятызм. Ідэйным стрыжнем паэзіі філаматаў і філарэтаў было вяртанне памяці аб магутнасці Айчыны, абуджэнне маладога пакалення да дзеяння ў справе вызвалення ад чужаземнага панавання. Патрыятычны светапогляд А. Петрашкевіча, Т. Зана, М. Рукевіча, А. Ходзькі быў па-мастацку ўвасоблены ў вобразах жраца, вайдэлота, таленавітага майстра – барскага воя-канфедэрата, якія з'яўляліся носьбітамі «духу продкаў»; у апісанні разбуранага замка, вобразах-рэчах чашы, табакеркі, якія сталі абазначаць повязь сучаснага маладога пакаленні з міфалогіяй і гісторыяй дзяржавы.

У раздзеле 3.3 **«Шляхціц і селянін як асноўныя персанажы ў літаратуры Беларусі першай паловы XIX стагоддзя»** выяўлены носьбіт ключавых рысаў нацыянальнага характару – шляхта. Паводле А. Міцкевіча, шляхціц павінен памятаць аб слаўным мінулым свайго роду, з пашанай ставіцца да традыцый краю, умацоўваць еднасць хрысціянскай веры. В. Дунін-Марцінкевіч у паэме «Благаславёная сям'я» робіць акцэнт на пачуцці эмпатыі заможных асоб да прыгнечаных і хворых. У гавэндзе У. Сыракомлі «Акраец хлеба» раскрываецца працавітасць, сумленнасць прадстаўнікоў беззямельнай шляхты.

У айчыннай літаратуры пачатку XIX стагоддзя стала сцвярджацца каштоўнасць асобы незалежна ад яе сацыяльнага стану. А. Марціноўскі ў творы «Машына для біцця сялян» высмейвае жорсткасць і здзек з падобнага да сябе чалавека. Вобраз селяніна выступае галоўным персанажам у творах В. Дуніна-Марцінкевіча, В. Каратынскага, У. Сыракомлі. Яны сцвярджаюць, што для селяніна праца – гэта неабходная форма быцця, яна пазбаўляе яго агрэсіўнасці, робіць цярплівым і памяркоўным.

У літаратуры сентыменталізму і рамантызму актывізаваўся працэс вылучэння жаночых вобразаў у шэрагу персанажаў – прадстаўнікоў нізкіх саслоўяў. Адметныя вобразы беларускай дзяўчыны знайшлі месца ў творчасці А. Міцкевіча, В. Дуніна-Марцінкевіча, В. Каратынскага. Яны валодаюць такім асабовымі дамінанатамі, як кемлівасць, працавітасць, неканфліктнасць, знешняя прывабнасць.

У раздзеле 3.4 **«Вобраз паэта ў творчасці пісьменнікаў Беларусі першай паловы XIX стагоддзя»** даследуецца вобраз паэта, што вымагае звярнуцца да еўрапейскага філасофскага і літаратурнага кантэксту, які ілюструе глыбокі аналіз творчай асобы і яе ролі ў грамадстве. У творчасці А. Міцкевіча вобраз паэта прадстаўлены як асоба самотная, у стане суму і тугі праз страту Радзімы, якая асацыюецца з сям'ёй, каханнем, сяброўствам. У. Сыракомля і В. Каратынскі ажыццяўляюць подступы да стварэння вобразаў паэтаў-дэмакратаў, нязменна адданых хрысціянскім ідэалам. В. Дунін-Марцінкевіч маніфестуе патрэбу селяніна ў беларускай кнізе, якая ўзнаўляе яго жыццё. Канцэпцыя вобраза паэта-грамадзяніна, які абараняе ідэю класавай салідарнасці на падмурку роднай мовы, становіцца наватарскай у літаратуры Беларусі першай паловы XIX стагоддзя.

У раздзеле 3.5 **«Сэнсаўтваральны патэнцыял эмоцый у літаратуры Беларусі першай паловы XIX стагоддзя»** акцэнтуецца ўвага на ўнікальнасці сентыменталізму і рамантызму, што выявілася ў звароце да эмоцыі як элемента, які ўздзейнічае на афармленне ідэйна-мастацкай цэласнасці твора. У айчыннай літаратуры першай паловы XIX стагоддзя дамінавалі дзве супрацьлеглыя эмоцыі – радасць і смутак. Эмоцыя радасці насычае творы, прысвечаныя ўхваленню добрых перспектыў жыцця («Энеіда навыварат»), сяброўству, каханню (А. Міцкевіч, Я. Чачот). Эмоцыя смутку, якая перарастае ў тугу і скруху, стварае трагічны пафас у творах патрыятычнай і грамадзянскай тэматыкі (Я. Аношка, А. Міцкевіч, У. Сыракомля, В. Каратынскі).

Глава 4 **«Эстэтычныя каштоўнасці ў літаратуры Беларусі першай паловы XIX стагоддзя»** звернута да твораў Я. Чачота, А. Міцкевіча, Я. Баршчэўскага, У. Сыракомлі, Г. Пузыны, В. Дуніна-Марцінкевіча, Я. Ходзькі, В. Каратынскага, Ю. Маралёўскага, Т. Лады-Заблоцкага, І. Храпавіцкага як аўтараў, у творчасці якіх найбольш былі прадстаўлены эстэтычныя каштоўнасці.

У раздзеле 4.1 **«Слова як эстэтычная рэальнасць у літаратурных творах Беларусі першай паловы XIX стагоддзя»** разглядаецца спецыфіка эстэтычнай каштоўнасці слова ў літаратуры Беларусі першай паловы XIX стагоддзя. Яна характарызуецца тым, што ўмовай яго мастацкага выяўлення стала польская мова. У даны перыяд у польскамоўных літаратурных тэкстах актывізаваліся беларуская ментальнасць, беларускі характар, беларускія прыродныя і рукатворныя локусы, беларуская кампазіцыйная мадэль. Гэта сцвярджаюць В. Каваленка, У. Мархель, А. Яскевіч, М. Лазарук.

Эстэтычнай вагі слова дасягае ў літаратуры рамантызму, калі яго важкасць праяўлялася не толькі ў тэксце, але і ў культурным кантэксце. Дзякуючы асацыяцыям, якія ўзнікаюць пры выяўленні сэнсу, слова набывае

метафарычнае значэнне, у пэўны момант становіцца сімвалам, узбагачаным глыбокай задумай. Рамантыкі не толькі карысталіся моцай сімвала, але і даследавалі гэты мнагазначны вобраз (працы І. Канта, Ф. Шэлінга, Г. В. Ф. Гегеля, Ф. Крэйцэра). У рускім літаратуразнаўстве ХХ стагоддзя сімвал становіцца аб’ектам навукі семіётыкі, дзе ён выступае знакам культуры (Ю. М. Лотман).

У літаратуры Беларусі першай паловы ХІХ стагоддзя здзяйсняўся пераход ад мастацтва класіцызму да рамантызму. Флораалегорыя антычнасці – лаўр і кіпарыс – звязана з веліччу герояў, якія абаранялі чалавечнасць, любоў, свабоду, і шляхетнай смерцю (А. Гарэцкі).

Флорасімволіка мастацтва рамантызму пачынаецца з блакітнай кветкі – складанага амбівалентнага знака, які сімвалізаваў нябесную дасканаласць і зямное каханне, рэальнасць і сон, памяць і забыццё (Наваліс). Блакітная кветка пазначана ў творах пісьменнікаў-рамантыкаў канкрэтным фітонімам: барвенак, васілёк, званочак, незабудка, фіялка, браткі.

Айчынныя пісьменнікі аддавалі перавагу не абстрактным формам і выявам, а рэальным, вядомым усім кветкам, што прадстаўлялі флору сельскага, ляснога, азёрнага пейзажу. Паколькі ўсе адценні блакітнага колеру – сіні, фіялетавы, бэзавы – фігуруюць у палітры фарбаў тутэйшых мастакоў слова, то гэта дэманструе сувязь з еўрапейскай рамантычнай традыцыяй. Кветкавая сімволіка рэалізуецца ў вобразе блакітнага лёну, браткаў, незабудкі ў творчасці Я. Чачота і Я. Баршчэўскага як мастацкая адзнака дзявочага хараства, цнатлівасці, памяці аб красе Айчыны. Фіялка, дзядоўнік, валошка паўстаюць як варыяцыі блакітнай кветкі ў творчасці А. Міцкевіча, В. Дуніна-Марцінкевіча і азначаюць някідкую прыгажосць беларускага пейзажу і пакланенне перад хараством і каханнем.

У вытлумачэнні сутнасці белых кветак лілеі, пралескі і канваліі неабходна звярнуць увагу на этымалогію лексемы «blau», яе сувязі са старажытным коранем, які выяўляе адценні белага – амаль да блакітна-бліскучага, нябеснага. У паэзіі А. Міцкевіча, Я. Чачота яны служаць сімваліка-метафарычным сродкам рэпрэзентацыі адданага, шчырага сяброўства і кахання, вечнай памяць аб нявінна і гераічна загінулых.

Вобраз ракі ў літаратуры Беларусі першай паловы ХІХ стагоддзя выступае як дамінуючы. Водная стыхія ракі адпавядала настрою паэтаў-рамантыкаў – Я. Чачота, А. Міцкевіча, У. Сыракомлі, В. Каратынскага, В. Дуніна-Марцінкевіча, Т. Лады-Заблоцкага. Яна мадэлюе рух як па гарызанталі – сувязь з малой радзімай, – так і па вертыкалі – з гісторыяй свайго роду, мінулым і будучым Айчыны. Для Я. Чачота рака Мышанка з’яўляецца сімвалам шчаслівага дзяцінства, а таксама хронікай яго землякоў-ліцвінаў. Рака Нёман стала сімвалам слаўнай гісторыі, а таксама малой радзімы для А. Міцкевіча, У. Сыракомлі, В. Каратынскага. У паэзіі В. Дуніна-Марцінкевіча рака Іслач метафарызавала ціхамірнае старасвецкае

жыццё шляхты. Рэкі Дзвіна і Вілія ў творах А. Міцкевіча і Т. Лады-Заблоцкага ўвасабляюць перыпетыі лёсу беларускага народа ў канкрэтна-гістарычным часе позняга сярэднявечча, калі адбывалася барацьба за свабоду і незалежнасць ад ворагаў з паўночна-заходніх межаў.

У раздзеле 4.2 **«Эстэтычнае мадэляванне зместу літаратуры Беларусі ў вытокавы перыяд»** даследуецца праблема вытокавага перыяду, на вырашэнне якой скіраваны асноўныя творчыя намаганні – выпрацоўка формаў адлюстравання нацыянальнага жыцця. Галоўнай формай выяўлення ідэйна-мастацкага зместу пачынальнікі айчыннай літаратуры выбралі песню. Гэта абумоўлена не толькі прэцэдэнтным зваротам рамантыкаў да жанравага багацця фальклору, але і спецыфікай структуры – абавязковай страфічнасцю, прастатой тэксту, адсутнасцю складаных прыёмаў, дакладнасцю рыфмы. Даны жанр меласу на працягу свайго бытавання ў акрэслены перыяд змяняўся тэматычна і структурна. Папулярнымі былі гістарычныя песні (Ю. У. Нямцэвіч, Я. Чачот, А. Гарэцкі), балады (А. Міцкевіч, Я. Чачот, Т. Зан), рамансы (А. Міцкевіч), санеты (А. Міцкевіч, Я. Баршчэўскі, Т. Лада-Заблоцкі, А. Грот-Спасоўскі), калыханкі (У. Сыракомля, В. Каратынскі). В. Каратынскі бачыў у інтэрпрэтацыі народных казачных сюжэтаў адзін з прынцыпаў развіцццця нацыянальнай літаратуры.

Ствараецца ўражанне, што аўтарская песенная паэзія адаптавалася да класічных літаратурных жанраў і фальклорныя элементы спантанна пранікалі ў літаратурныя тэксты эпохі рамантызму. Аднак неабходна ўлічваць тое, што многія прадстаўнікі гэтага перыяду не толькі цікавіліся народнай творчасцю, але свядома выкарыстоўвалі сюжэты, матывы, сродкі прастамоўя ў сваіх тэкстах; яны актыўна збіралі і публікавалі помнікі вуснай народнай творчасці (Я. Чачот, А. Рыпінскі, І. Храпавіцкі). У драматургічным мастацтве Беларусі першай паловы XIX стагоддзя адбываецца дэкананізацыі (рамантызацыя) класікі, калі аўтарскі (суб’ектыўны) элемент дае ацэнкі рэчаіснасці і выкарыстоўвае формы не толькі драматычнага, але і эпічнага і лірычнага пісьма. У эстэтычнай камунікацыі герояў п’ес і гледачоў узнікае аўтарскае «я», не тоеснае цэнтральным персанажам (Я. Чачот, А. Міцкевіч, В. Дунін-Марцінкевіч).

Літаратары імкнуліся асэнсаваць маральны аспект мыслення народа ў блізкіх яму формах. Я. Баршчэўскі, В. Каратынскі, В. Дунін-Марцінкевіч выбіралі для гэтага жанры фантастычнага апавядання, казкі, вершаванага апавядання. Асэнсаванне сюжэтаў і жанраў фальклору падпарадкоўвалася задачам выхавання сучаснага паэту грамадства і спробам стварэння свайго сюжэта пра ідэальнае сямейнае жыццё, а таксама пра абавязкі правіцеляў, паноў лічыцца з пачуццямі простага народа.

## ЗАКЛЮЧЭННЕ

### Асноўныя навуковыя вынікі дысертацыі

1. Эстэтычны ідэал вызначаюць як уяўленне аб норме эстэтычнай дасканаласці мастацкага твора. Мастацкая свядомасць валодае магчымасцю быць бліжэй да рэальнага лёсу чалавека, яна свабодная і раскаваная, таму фарміруе ўяўленне аб змястоўна-фармальных складальніках эстэтычнага ідэалу. Расійскія навукоўцы А. Ф. Лосеў і В. П. Шастакоў, характарызуючы эстэтычныя катэгорыі ў манаграфіі «Гісторыя эстэтычных катэгорый» (1965), акрэсліваюць тры групы, якія адносяцца да сферы прыгожага. Кіруючыся характарыстыкамі эстэтычнага ідэалу, можна рэлятывізаваць данае паняцце з «філасофіі мастацтва» ў літаратуразнаўства. Кожная з груп адпавядае ўзроўням раскрыцця эстэтычнага ідэалу – канцэптуальнаму; узроўню арганізацыі твора як мастацкага цэлага; узроўням “унутранай” і знешняй формы літаратурнага твора. Аналіз навуковага набытку другой паловы XX стагоддзя прывёў да неабходнасці ўліку нацыянальнай спецыфікі літаратуры ў эпоху актыўнага фарміравання беларускай ідэнтычнасці [8–А].

Білінгвістычная літаратура Беларусі першай паловы XIX стагоддзя аналізавалася ў жанрах крытычных артыкулаў, дакументальных нарысаў і нататак. Пра ролю крытыка як эксперта якасці твора і аўтарытэта ў выпрацоўцы прынцыпаў успрымання мастацкіх тэкстаў разважаў нямецкі філосаф Ё. Г. Фіхтэ. Аналітык літаратурнага тэксту павінен бачыць недахопы, бо ведае пра прадмет больш, чым сам аўтар. Фактамі развіцця эстэтычнай думкі данага перыяду сталі работы П. Галяньскага, Э. Славацкага, Л. Бароўскага, А. Доўгірда, якія ўказвалі на залежнасць развіцця мастацкай культуры ад геаграфічных і палітычных фактараў. Айчынныя творцы пачатку і сярэдзіны XIX стагоддзя – А. Міцкевіч, Я. Чачот, Т. Зан, Я. Баршчэўскі, У. Сыракомля, В. Каратынскі, В. Дунін-Марцінкевіч, Т. Лада-Заблоцкі, Ю. І. Крашэўскі – не толькі трымаліся праўды жыцця ў творчасці, але і ацэньвалі чужыя мастацкія тэксты з улікам адпаведнасці народным ідэалам хараства. Праведзенае Р. Падбярэскім даследаванне творчасці Я. Баршчэўскага дазволіла адзначыць прыкметы «гофманізму» як прыёму адлюстравання метафізічнасці народнага погляду [4–А].

Беларуская даследчыцкая думка пачатку XX стагоддзя недаацэньвала творчасць польскамоўных пісьменнікаў, адмаўляла ім ва ўдзеле ў фарміраванні эстэтычных арыенціраў айчыннай літаратуры. Але М. Багдановіч, М. Гарэцкі адзначалі ў літаратуры білінгвічных аўтараў

«народны дух», што можна атаясамліваць з паняццем «эстэтычны ідэал». Аўтар першай «Гісторыі беларускае літаратуры» высока ацэньваў дзейнасць навуковых і творчых сіл, сканцэнтраваных у Віленскім універсітэце, бо моладзь не толькі цікавілася мінуўшчынай свайго краю, але і па-мастацку ўвасабляла яе.

Пачынаючы з сярэдзіны XX стагоддзя і па сённяшні момант беларускія перакладчыкі і навукоўцы паступова ўводзяць у айчынны літаратурны працэс польскамоўныя тэксты. Асобныя навуковыя артыкулы І. Э. Багдановіч, А. С. Яскевіча, У. М. Конана, І. Бурдзялёвай, С. Мінскевіча, І. В. Саверчанкі выяўляюць і характарызуюць пэўныя элементы, якія складаюць эстэтычны ідэал літаратуры: хрысціянскія каштоўнасці, асаблівасці паэтыкі, формы мастацкіх твораў [10–А; 20–А; 23–А; 27–А].

2. Паводле А. Ф. Лосева і В. П. Шастакова, сярод катэгорый камічнага, трагічнага, узвышанага, нізкага, лірычнага, драматычнага, пачварнага, якія адносяцца да сферы эстэтычнага і з’яўляюцца спосабам перадачы жыцця ў мастацкім творы, прысутнічае іранічнае. Эстэтычная катэгорыя іроніі, якая была актуалізавана ў эпоху рамантызму, знайшла розныя шляхі праяўлення ў літаратуры Беларусі першай паловы XIX стагоддзя. Рамантычная іронія як тып мастацкага мыслення выяўлена ў псеўдападыходзе да гісторыі ў аповесці «Не заўсёды так робіцца, як гаворыцца» Г. Мастоўскай. Сатырычным пафасам прасякнута апісанне дзейнасці дзяржаўных кіраўнікоў і шляхты ва «Успамінах Сапліцы» Г. Жавускага, у творы І. Яцкоўскага «Аповесць з майго часу, альбо Літоўскія прыгоды». Рамантычная іронія ў аповесці Я. Баршчэўскага «Шляхціц Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях» выявілася на канцэптуальным узроўні – ідэі супярэчлівага паказу беларускай шляхты; у мастацкім свеце твора – вобразы Сына Буры і Чорнага ката. Рамантычная іронія як эстэтычны прынцып беларускага рамантызму рэалізавалася ў сінтэзе дзвюх непадобных, супярэчлівых філасофскіх канцэпцый – нямецкай і англійскай, што знайшло адлюстраванне ў творчасці айчынных пісьменнікаў [8–А].

Рамантычная іронія ўплывала на кампазіцыю твораў літаратуры Беларусі першай паловы XIX стагоддзя. Гэта праявілася ў бурлескна-травесційных паэмах «Энеіда навыварат» і «Тарас на Парнасе», дзе антычная міфалогія служыць фонам для дзеяў новага героя літаратуры, носьбіта нацыянальных і народных прынцыпаў жыцця. Маладыя паэты-філаматы напаўнялі высокія жанры паэзіі карцінамі штодзённасці, узвышаючы такім спосабам дзяцінства, сяброўства да ўзорных тэм паэзіі. Традыцыі гофманаўскай іроніі найбольш выявіліся ў творчасці Я. Баршчэўскага. Кампазіцыя кнігі «Шляхціц Завальня, або Беларусь у фантастычных

апавяданнях» нагадвае будову кнігі Э. Т. А. Гофмана «Серапіёнавы браты», дзе важную ролю адыгрывае рамачная канструкцыя. Аналіз апавяданняў паказаў, што менавіта судакрананне містыкі з зямным, матэрыяльным пачаткам служыць выкрыццю заганаў сацыяльнага і палітычнага жыцця. Прыхаваная ўсмешка Я. Баршчэўскага, з якой ён стварае «двухсветавасць» быцця герояў, пераходзіць у сатыру, калі аўтар заглыбляецца ў малапрывабны зямны побыт насельнікаў Паўночнай Беларусі («Радзімы знак на вуснах», «Плачка», «Белая сарока», «Пакутны дух», «Чараўнік ад прыроды і кот Варгін») [10–А; 12–А; 19–А].

3. Дасканаласць, мэтазгоднасць, гераізм, творчасць – тое прыгожае, што праяўляецца ў самім жыцці, у маральным і эстэтычным абліччы асобы. Таму важным аспектам аналізу з’яўляецца мастацкі свет літаратурнага твора. Для прадстаўнікоў мастацкага слова Беларусі першай паловы XIX стагоддзя ўласціва завастрэнне ў вобразах духоўна-хрысціянскага пачатку, які з’яўляецца базавым у творчасці Я. Чачота, У. Сыракомлі, В. Каратынскага, Я. Баршчэўскага. Яны сцвярджаюць, што духоўна-хрысціянскія каштоўнасці любові, цноты, пакаяння замацаваны ў генетычнай памяці беларусаў [1–А; 2–А; 4–А; 13–А].

Першая палова XIX стагоддзя паўстае тым перыядам, калі ў літаратуры Беларусі найбольш яскрава вылучылася гісторыка-патрыятычная тэма. Аналіз твораў Ю. І. Крашэўскага, А. Петрашкевіча, Т. Зана, А. Ходзькі, А. Міцкевіча паказаў, што даная тэма абумоўлена спецыфікай нацыянальнага характару, генеральнай дамінантай з’яўляецца павага да памяці продкаў [7–А; 4–А; 17–А].

Галоўныя літаратурныя персанажы – шляхціц і селянін – прадстаўляюць два асноўныя сацыяльныя класы тагачаснай Беларусі. У творах А. Міцкевіча выяўляецца ўстойлівая мадэль шляхетнасці: «паходжанне, узрост і веры еднасць». Прадстаўніку шляхецтва належыць ведаць слаўнае мінулае свайго роду, паважаць і шанаваць носьбітаў традыцыйнага светапогляду, умацоўваць згоду носьбітаў хрысціянскай веры. Даная мадэль шляхетнасці прадстаўлена ў творчасці В. Дуніна-Марцінкевіча. Вобразы дробных землеўладальнікаў або арандатараў звязаны з ідэяй вольнай працы на зямлі. Абрабляць зямлю, на думку У. Сыракомлі, Я. Баршчэўскага, – значыць жыць годным, паўнакроўным, сумленным жыццём. Гэтая экзістэнцыйная стратэгія вобраза дробнага шляхціца збліжае яго з вобразам селяніна, які выступае галоўным персанажам у творах В. Дуніна-Марцінкевіча, В. Каратынскага, У. Сыракомлі. Абсалютнай каштоўнасцю для селяніна з’яўляецца праца, якая пазбаўляе чалавека агрэсіўнасці, робіць яго цярплівым, памяркоўным. Аднак гэтыя якасці

характару вельмі часта мяжуюць з абыякавасцю і сацыяльнай апатыяй, што, у сваю чаргу, вядзе да п'янства, якое ў творчасці вышэй пералічаных аўтараў служыць аб'ектам выкрыцця.

У літаратуры Беларусі першай паловы XIX стагоддзя прысутнічаюць вобразы, якія прадстаўляюць пэўны сацыяльны тып з канкрэтнымі рысамі. Жаночыя вобразы, дзяўчыны-шляхцянкі і дзяўчыны-сялянкі, вызначаюцца прастатой, натуральнасцю, разняволенасцю, глыбокадумнасцю, дасціпнасцю. У творах В. Дуніна-Марцінкевіча створаны «культ жанчыны»: жаночыя персанажы з'яўляюцца носьбітамі хрысціянскай маралі, чалавекалюбства, вернасці каханню, вонкавай прывабнасці [4–А; 13–А; 16–А].

Літаратура Беларусі першай паловы XIX стагоддзя фарміруе новы мастацкі вобраз – вобраз паэта. Сацыяльная і эстэтычная значнасць гэтага вобраза вынікае з досыць актыўнай прадстаўленасці персанажа-паэта ў творчасці А. Міцкевіча, У. Сыракомлі, В. Каратынскага, В. Дуніна-Марцінкевіча. У творчасці слыннага рамантыка А. Міцкевіча вобраз паэта набывае асаблівыя канатацыі – гэта вандроўнік-выгнаннік, пілігрым у пошуках Святой Зямлі, якая ўвасоблена ў роднай Наваградчыне. У творах Вясковага Лірніка і яго вучня дамінуе асэнсаванне прызначэння паэта: творца выступае ў іпастасі прарока-правадыра, самаахвярнага служыцеля народу. У творах Беларускага Дудара з'яўляецца паэт-грамадзянін, для якога сітуацыя паэтычнага натхнення магчымая толькі ў народным асяроддзі [22–А; 25–А].

Аб'ектам мастацкага адлюстравання ў літаратуры Беларусі першай паловы XIX стагоддзя становіцца эмацыянальнае жыццё асобы. Гэта адпавядала асноўным тагачасным тэндэнцыям развіцця еўрапейскай і амерыканскай літаратуры, дзе панавалі сентыменталізм і рамантызм. Дамінуючай эмоцыяй пачатку новай беларускай літаратуры стала радасць. Першыя беларускамоўныя тэксты «Энеіда навыварат», «Тарас на Парнасе», імянінныя віншаванні, пераважная большасць уласных вясковых песень Я. Чачота сцвярджаюць аптымістычны погляд на жыццё, падстава якога – вера ва ўласныя працавітасць, кемлівасць, знаходлівасць, таленавітасць, сілу сяброўства і кахання. Эмоцыю смутку звычайна адносяць да негатыўных, аднак яе частае ўзнаўленне ў творчасці А. Міцкевіча, А. Петрашкевіча, Я. Чачота, Я. Баршчэўскага, Г. Пузыны, У. Сыракомлі, В. Каратынскага ўказвае і на важныя для творцаў каштоўнасці канструктыўнага характару – родная зямля і блізкія людзі, пакінутыя змушана; слаўная гісторыя Айчыны, якую мала згадваюць сучаснікі [3–А; 13–А; 16–А; 19–А; 22–А; 25–А].

4. Паэтычная мова адрозніваецца ад натуральнага маўлення сваёй складанасцю, здольнасцю перадаваць такі аб'ём інфармацыі, які не даступны

для перадачы іншымі сродкамі. Творчыя суб’екты не ізаляваныя, не замкнёныя ў сабе, а далучаны да культурнага кантэксту свайго народа і чалавецтва. Да гэтага часу дыскутуецца пытанне культурнай прыналежнасці мастацкіх тэкстаў, у якіх імплікаваны беларуская ментальнасць, беларускі характар, беларускія прыродныя і рукатворныя локусы. Польскамоўная літаратура як форма духоўнай культуры не можа быць выкраслена з мастацкай спадчыны народа толькі таму, што творы напісаны не па-беларуску [2–А; 5–А; 6–А; 7–А; 9–А; 14–А].

Аналіз мастацкіх тэкстаў выявіў у якасці культурных канстант і сімвалаў прэцэдэнтныя расліны і локусы, якія маюць усеагульнае значэнне. Літаратура Беларусі першай паловы XIX стагоддзя годна рэалізуе вобраз кветкі як сімвала рамантызму («Генрых фон Аўтэрдынген» Навaліса), што паўстае ў паэзіі Я. Чачота («Канвалія», «Лён»), А. Міцкевіча («Свіцязь», «Лілеі», «Пан Тадэвуш», «Ранак і вечар», «Пралеска»), Я. Баршчэўскага («Шляхціц Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях», «Браткі»), У. Сыракомлі (уступ да гавэнды «Акраец хлеба»), Г. Пузыны («Фіялкі зімою»), В. Дуніна-Марцінкевіча («Літаратурныя клопаты»). Флоравобразы незабудкі, лёну, браткаў, канваліі, пралескі, лілеі, фіялкі ўвасабляюць нацыянальную канцэпцыю Красы, якая пазней знойдзе сваю мастацкую рэалізацыю ў творчасці М. Багдановіча [14–А; 18–А;24–А; 26–А; 28–А].

Локус ракі, які часта ўзнаўляецца ў тэкстах прадстаўнікоў беларускага рамантызму, з’яўляецца адметнай прыкметай беларускага ландшафту, «месцаразвіццём» нашага этнасу. Нёман, Дзвіна, Палата, Вілія, Лучоса непарыўна звязаны з гістарычным лёсам тутэйшых жыхароў, а іх вобразы ўзбагачаюць мастацкі код нашай культуры. Рака сімвалічна ўвасабляе кірунак, дынаміку руху, набліжэнне чалавека эпохі рамантызму да родных вытокаў, ператвараючыся ў нацыянальны локус культуры. Рукатворны локус кургана ў эстэтычнай рэальнасці стварае сімвалічны дыялог сучасніка з безыменнымі героямі слаўнай гісторыі краю [6–А; 23–А; 26–А].

Эстэтычная мадэль выяўлення мастацкага зместу літаратуры Беларусі даследаванага перыяду абумоўлена асноўным прынцыпам рамантызму – зваротам да народнай творчасці, актуалізацыяй народных форм выяўлення нацыянальнага быцця. Паказчык дэмакратызацыі мастацкай літаратуры можна ўбачыць зыходзячы з аналізу генезісу найбольш распаўсюджаных жанраў паэзіі – балады, раманса, санета, гістарычнай песні, якія ўсе аформіліся з песні як лірычнага жанру, дзе ёсць экспрэсіўнасць і эмацыянальнасць. Калыханка атрымала аўтарскае перастварэнне ў творчасці У. Сыракомлі, В. Каратынскага, якія даюць каментар да пакутніцкай ролі паэта ў грамадстве.

Эпічнае і драматургічнае адлюстраванне жыцця ў літаратуры Беларусі першай паловы XIX стагоддзя імкнецца да мінімалізацыі формы. Таму найбольшую папулярнасць набываюць жанры кароткай драматургічнай пастаноўкі (Я. Чачот, В. Дунін-Марцінкевіч), вершаванага апавядання, гавэнды, навелы (В. Дунін-Марцінкевіч, У. Сыракомля, Я. Баршчэўскі) [21–А; 23–А; 26–А; 28–А].

**Рэкамендацыі па практычным выкарыстанні вынікаў**

Асноўныя палажэнні і вывады дысертацыйнага даследавання мэтазгодна выкарыстоўваць у далейшых распрацоўках праблемы эстэтычнага ідэалу ў літаратуры, рамантычнай іроніі і яе эвалюцыі ў творах беларускіх аўтараў.

## СПІС ПУБЛІКАЦЫЙ САІСКАЛЬНІКА ВУЧОНАЙ СТУПЕНІ

**Артыкулы ў навуковых выданнях, рэкамендаваных ВАК, якія адпавядаюць п. 19 Палажэння аб прысуджэнні вучоных ступеней і прысваенні вучоных званняў у Рэспубліцы Беларусь**

1–А. Салдаценкава (Косціна), Ж. В. Духоўны свет чалавека ў творчасці Уладзіслава Сыракомлі (X клас) / Ж. В. Салдаценкава (Косціна) // Беларуская мова і літаратура. – 2003. – № 4 (33). – С. 118–123.

2–А. Косціна, Ж. В. Эстэтычны ідэал паэзіі Яна Чачота / Ж. В. Косціна // Веснік БарДУ. Серыя: Педагагічныя навукі. Псіхалагічныя навукі. Філалагічныя навукі (Літаратуразнаўства). – 2014. – Вып. 2.– С. 74-79.

3–А. Костина, Ж. В. Классики русской литературы в филологической мысли Беларуси XIX века / Ж. В. Костина // Вестник ШГПУ. – 2020. – №1 (45). – С. 119–121.

4–А. Косціна, Ж. В. Эстэтычны ідэал паэзіі Вінцэся Каратынскага ў кантэксце сентыменталізму / Ж. В. Косціна // Веснік БарДУ. Серыя «Педагагічныя навукі. Псіхалагічныя навукі. Філалагічныя навукі (літаратуразнаўства)». – 2020. – Вып. 8. – С. 157–162.

5–А. Косціна, Ж. В. Жанр балады ў творчасці Яна Чачота як эстэтычна значымая форма для літаратуры Беларусі першай паловы XIX стагоддзя / Ж. В. Косціна // Соціально-гуманітарний вісник : зб. наук. пр. / СГ НТМ «Новий курс». – Харків, 2020. – Вип. 34. – С. 126–130.

6–А. Косціна, Ж. В. Локус гары і кургана ў літаратуры Беларусі першай паловы XIX стагоддзя / Ж. В. Косціна // Мова і культура. – 2020. – Вип. 22, т. VII (202). – С. 127–132.

7–А. Косціна, Ж. В. Патрыятызм у сістэме эстэтычных каштоўнасцей літаратуры Беларусі першай паловы XIX стагоддзя / Ж. В. Косціна // Веснік БарДУ. Серыя «Педагагічныя навукі. Псіхалагічныя навукі. Філалагічныя навукі (літаратуразнаўства)». – 2021. – Вып. 2 (10). – С. 110–114.

8–А. Косціна, Ж. В. Эстэтычны ідэал літаратуры Беларусі першай паловы XIX стагоддзя як аб’ект даследавання / Ж. В. Косціна // Беларуская думка. – 2024. – №5. – С. 97–103.

**Артыкулы ў зборніках навуковых работ**

9–А. Косціна, Ж. В. Асаблівасці развіцця жанру аўтарскай казкі ў творчасці Вінцэся Каратынскага / Ж. В. Косціна // Аксиологический диапазон художественной литературы : сборник научных статей / Витеб. гос. ун-т ; под науч. ред. В. Ю. Боровко, Е. В. Крикливец. – Витебск, 2020. – С. 109–111.

10–А. Косціна, Ж. В. Эстэтычны ідэал паэзіі Вінцэся Каратынскага ў кантэксце рамантызму / Ж. В. Косціна // Актуальные проблемы филологии :

сб. науч. ст. / Гомельский гос. ун-т имени Франциска Скорины. – Гомель, 2020. – Вып. 13. – С. 73–78.

11–А. Косціна, Ж. В. Хрысціянскія каштоўнасці як аснова эстэтычнага ідэалу паэзіі Уладзіслава Сыракомлі / Ж. В. Косціна // Романовские чтения – 15 : сборник статей Междунар. науч. конф., Могилев, 26-27 ноября 2020 г. / под общ. ред. А. С. Мельниковой. – Могилев, 2021. – С. 152–153.

12–А. Косціна, Ж. В. Актуальнасць аналізу эстэтычнага ідэалу мастацкіх твораў у сучасным беларускім літаратуразнаўстве / Ж. В. Косціна // Трынаццатыя Танкаўскія чытанні : зб. навук. арт. / Беларус. дзярж. пед. ун-т імя М. Танка ; рэдкал.: В. Д. Старычонак (адк. рэд.) [і інш.]. – Мінск, 2022. – С. 142–146.

**Матэрыялы канферэнцый**

13–А. Салдаценкава (Косціна), Ж. В. «Не я пяю – народ божы…» (хрысціянска-дэмакратычныя ідэалы і народная эстэтыка паэзіі Уладзіслава Сыракомлі) / Ж. В. Салдаценкава (Косціна) // Уладзіслаў Сыракомля : Матэрыялы Міжнар. навук. канф., прысв. 180-годдзю з дня нараджэння пол. і бел. паэта і этнографа, Мінск-Любань, 29-30 верасня 2003 г. / “Беларускі кнігазбор” ; рэдкал.: А. Мальдзіс (гал. рэд.) [і інш.].– Мінск, 2004. – С. 47–52.

14–А. Салдаценкава (Косціна), Ж. В. Максім Багдановіч і літаратурная традыцыя XIX ст. / Ж. В. Салдаценкава (Косціна) // Максім Багдановіч – празаік, крытык, публіцыст : матэрыялы Міжнар. навук.-практ. канф., Мінск, 29 лістапада 2005 г. / Літ. музей М. Багдановіча ; уклад. І. В. Мышкавец. – Мінск, 2006. – С. 92–96.

15–А. Салдаценкава (Косціна), Ж. В. Асаблівасці тыпу творчасці Вінцэся Каратынскага / Ж. В. Салдаценкава (Косціна) // Вінцэсь Каратынскі ў беларуска-славянскім літаратурным узаемадзеянні : матэрыялы Рэсп. навук. канф., Мінск, 29 верасня 2006 г. / Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т літ. імя Я. Купалы ; рэдкал.: У. Мархель (гал. рэд.) [і інш.] – Мінск, 2006. – С. 85–92.

16–А. Косціна, Ж.В. Праблема нацыянальнай мовы ў літаратурна-крытычных матэрыялах XIX стагоддзя / Ж.В. Косціна // Актуальные проблемы компаративистики : сб. материалов / Брест. гос. ун-т имени А. С. Пушкина ; редкол.: С. А. Королевич, С. Ф. Бут-Гусаим, Т. Ф. Кабот. – Брест, 2010. – С. 165–167.

17–А. Косціна, Ж. В. Гістарычны матыў у творчасці Ю. І. Крашэўскага / Ж. В. Косціна // Міжнародныя Шамякінскія чытанні “Пісьменнік – Асоба – Час” : матэрыялы III Міжнар. навук.-практ. канф., Мазыр, 27 верасня 2013 г. / УА МДПУ імя І. П. Шамякіна ; рэдкал.: А. У. Сузько (адк. рэд. ) [і інш.]. – Мазыр, 2013. – С. 102–105.

18–А. Косціна, Ж. В. Беларуская літаратура XIX стагоддзя ў тэарэтыка-крытычных матэрыялах Максіма Гарэцкага / Ж. В. Косціна // Максім і Гаўрыла Гарэцкія. Жыццё і творчасць (прысвячаецца 125-годдзю з дня нараджэння Максіма Гарэцкага) : матэрыялы XXVI Гарэцкіх чытанняў,

Мінск, 19 красавіка 2018 г. / Дзярж. музей гісторыі бел. літ., Рэспубліканскі фонд імя братоў Гарэцкіх, Цэнтр даследав. бел. культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі ; рэдкал.: Р. Гарэцкі (адк. рэд.) [і інш.]. – Мінск, 2018. – С. 93–97.

19–А. Косціна, Ж. В. Постаці прадстаўнікоў рускай славеснасці ў філалагічнай думцы Беларусі XIX стагоддзя // Славянский мир: духовные традиции и словесность : сборник материалов Международной научной конференции / М-во науки и высш. обр. РФ. – Тамбов, 2019. – Вып. 9. – С. 107–112.

20–А. Косціна, Ж. В. Максім Гарэцкі: «Гісторыя беларускае літаратуры»: асаблівасці развіцця рамантызму ў Беларусі / Ж. В. Косціна // Максім і Гаўрыла Гарэцкія. Жыццё і творчасць (прысвячаецца 100-годдзю выхаду ў свет аповесці «Дзве душы» і 90-годдзю афіцыйнага надання Гаўрылу Гарэцкаму звання акадэміка Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі) : матэрыялы XXVII Гарэцкіх чытанняў, Мінск, 14 чэрвеня 2019 г. / Дзярж. музей гісторыі бел. літ., Рэспубліканскі фонд імя братоў Гарэцкіх, Цэнтр даследав. бел. культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі ; рэдкал.: Р. Гарэцкі (адк. рэд.) [і інш.]. – Мінск, 2019. – С. 101–104.

21–А. Косціна, Ж. В. Літаратурны працэс XIX стагоддзя ў Беларусі і Кітаі: тоеснае і адрознае / Ж. В. Косціна // Беларусь и Китай: многовекторность сотрудничества : материалы III Научн.-практ. круглого стола в рамках реализации цикла научн.-практ. мероприятий «Цифровой конгресс-2020», Барановичи, 13 марта 2020 г. / М-во образования Республики Беларусь, Баранович. гос. ун-т ; редкол.: В. В. Климук (гл. ред.) [и др.]. – Барановичи, 2020. – С. 23–28.

22–А. Косціна, Ж. В. Вобраз паэта ў літаратуры Беларусі першай паловы XIX стагоддзя / Ж. В. Косціна // «GLOBAL SCIENCE AND INNOVATIONS 2020: CENTRAL ASIA». Серия «Филологические науки». – 2020. – Т. II, № 4 (9). – С. 97–100.

23–А. Косціна, Ж. В. Аналагічныя феномены ў беларускай і кітайскай паэзіі XIX-XX стст. : гісторыка-культурны кантэкст / Ж. В. Косціна // Искусство слова в диалоге культур: проблемы компаративистики : материалы Междунар. науч.-практ. конф., Брест, 12-13 марта 2020 г. / Брест. гос. ун-т им. А. С. Пушкина ; редкол.: С. С. Клундук, О. Н. Ковальчук, И. А. Ворон. – Брест, 2020. – С. 243–247.

24–А. Косціна, Ж. В. Локус кургана ў літаратуры Беларусі першай паловы XIX стагоддзя / Ж. В. Косціна // Наука – практике : материалы I Междунар. науч.-практ. конф., Барановичи, 15 мая 2020 г. : в 2 ч. / М-во образования Республики Беларусь, Баранович. гос. ун-т ; редкол.: В. В. Климук (гл. ред.) [и др.]. – Барановичи, 2020. – Ч. 1. – С. 178–180.

25–А. Косціна, Ж. В. Вобраз вандроўніка ў літаратуры Беларусі першай паловы XIX стагоддзя / Ж. В. Косціна // Глухівські читання - 2021. Актуальні питання суспільних та гуманітарних наук : Збірник матеріалів XI

міжнародної науково-практичної інтернет-конференції, Глухів, 8-10 грудня 2021 г. / Глухівський національний педагогічний університет імені Олександра Довженка ; заг. ред. А. С. Полякова. – Глухів, 2021. – С. 250–251.

26–А. Косціна, Ж. В. Беларуская драматургія ў навукова-публіцыстычнай дзейнасці Максіма Гарэцкага / Ж. В. Косціна // Максім і Гаўрыла Гарэцкія. Жыццё і творчасць (прысвячаецца 100-годдзю з дня нараджэння Галіны Максімаўны Гарэцкай і 55-годдзю вяртання ў Беларусь Гаўрылы Іванавіча Гарэцкага) : матэрыялы XXIX Гарэцкіх чытанняў, Мінск, 30 чэрвеня 2021 г. / Дзярж. музей гісторыі бел. літ. ; рэдкал.: Р. Гарэцкі (адк. рэд.) [і інш.]. – Мінск, 2021. – С. 51–57.

27–А. Косціна, Ж. В. Фарміраванне эстэтычных прынцыпаў у літаратурнай крытыцы Беларусі XIX стагоддзя / Ж. В. Косціна // Наука – практике : материалы III Междунар. научн.-практ. конф., Барановичи, 19 мая 2022 г. : в 3 ч. / М-во образования Республики Беларусь, Баранович. гос. ун-т ; редкол.: В. В. Климук (гл. ред.) [и др.]. – Барановичи, 2022. – Ч. 1. – С. 197–198.

28–А. Косціна, Ж. В. Казкавыя матывы ў літаратуры Беларусі першай паловы XIX ст. / Ж. В. Косціна // Казка ў еўрапейскай прасторы 2: гісторыя і сучаснасць : матэрыялы II Міжнар. форуму даследчыкаў беларус. казкі, Мінск, 27–29 мая 2021 г. / Нацыянальная акадэмія навук Беларусі, Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры ; рэдкал.: А. І. Лакотка (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск, 2022. – С. 92–99.

**РЭЗЮМЭ**

**Косціна Жанна Вячаславаўна**

**ЭСТЭТЫЧНЫ ІДЭАЛ ЛІТАРАТУРЫ БЕЛАРУСІ ПЕРШАЙ ПАЛОВЫ XIX СТАГОДДЗЯ**

**Ключавыя словы:** літаратура Беларусі, ідэал, іронія, духоўныя каштоўнасці, гісторыя, вобразы шляхціца, селяніна, паэта, эмоцыя, кветка, рака, калыханка

**Мэта даследавання:** асэнсаваць літаратуру Беларусі першай паловы XIX стагоддзя ў аспекце вызначэння і апісання спецыфікі выяўлення эстэтычнага ідэалу ў творчасці пісьменнікаў.

**Метады даследавання:** тэарэтыка-літаратурны і агульнаэстэтычны падыходы з элементамі параўнальнага літаратуразнаўства і культуралогіі, палажэнні аксіялагічнага падыходу ў літаратуразнаўстве, семіётыцы, структуралізме.

**Асноўныя вынікі і іх навізна.** Упершыню ў беларускай навуцы літаратура Беларусі першай паловы XIX стагоддзя разглядаецца ў аспекце эстэтычнага ідэалу шляхам выяўлення асноўных тэм, вобразаў і формаў. Новым для даследавання гэтай тэмы з’яўляецца вызначэнне ролі рамантычнай іроніі.

Абгрунтавана месца духоўна-рэлігійных каштоўнасцей, гісторыка-патрыятычнай тэматыкі, вобразаў шляхціца, селяніна і паэта, эмоцыі ў мастацкім свеце літаратурных твораў.

Вызначана роля сімвалаў кветкі, ракі, кургана як эстэтычна каштоўных у тэкстах даследуемага перыяду. Раскрываюцца маладаследаваныя ў сучасным беларускім літаратуразнаўстве жанры калыханкі, аўтарскай казкі ў творчасці паэтаў-рамантыкаў.

**Рэкамендацыі па выкарыстанні, галіна прымянення.** Практычнае значэнне дысертацыі заключаецца ў тым, што яе вынікі дапаўняюць уяўленне пра развіцце літаратуры Беларусі першай паловы XIX стагоддзя, а разам з тым змястоўна-фармальны код айчыннага прыгожага пісьменства. Прадстаўленыя вынікі могуць быць выкрыстаны ў далейшым вывучэнні тэмы, а таксама ў выкладчыцкай дзейнасці.

# РЕЗЮМЕ

## Костина Жанна Вячеславовна

## ЭСТЕТИЧЕСКИЙ ИДЕАЛ ЛИТЕРАТУРЫ БЕЛАРУСИ ПЕРВОЙ ПОЛОВИНЫ XIX ВЕКА

**Ключевые слова:** литература Беларуси, идеал, ирония, духовные ценности, история, образы шляхтича, крестиянина, поэта, эмоция, цветок, река, колыбельная

**Цель исследования:** осмыслить литературу Беларуси первой половины XIX века в аспекте определения и описания специфики выявления эстетического идеала в творчестве писателей.

**Методы исследования:** теоретико-литературный и общеэстетический подход с элементами сравнительного литературоведения и культурологии, положения аксиологического подхода в литературоведении, семиотике, структурализме.

**Основные результаты и их новизна.** Впервые в белорусской науке литература Беларуси первой половины XIX века рассматривается в аспекте эстетического идеала путем выявления основных тем, образов и форм. Новым в исследовании этой темы является определение роли романтической иронии.

Обоснование места духовно-религиозных ценностей, историко-патриотической тематики, образов шляхчича, крестьянина и поэта, эмоции в художественном мире литературных произведений.

Определена роль символов цветка, реки, кургана как эстетической ценности в текстах исследуемого периода. Раскрыты малоисследованые в современном белорусском литературоведении жанры колыбельной, авторской сказки в творчестве поэтов-романтиков.

**Рекомендации по использованию, область применения.** Практическое значение диссертации заключается в том, что её результаты дополняют представление о развитии литературы Беларуси первой половины XIX века, и вместе с тем содержательно-формальный код отечественной прекрасной письменности. Представленные результаты могут быть использованны в дальнейшем изучении темы, а также в преподавательской деятельности.

## SUMMARY

**Kostina Zhanna**

## AESTHETIC IDEAL OF BELARUSIAN LITERATURE OF THE FIRST HALF OF THE XIX CENTURY

**Keywords:** literature of Belarus, ideal, irony, spiritual values, history, image of a nobleman, peasant, poet, emotion, river, lullaby

**The aim of the research:** to comprehend the literature of Belarus of the first half of the XIX century in the aspect of defining and describing the specifics of revealing the aesthetic ideal in the works of writers.

**Methods of the research:** theoretical-literary and general aesthetic approach with elements of comparative literature and cultural studies, provisions of axiological approach in literary studies, semiotics, structuralism.

**Main results and their novelty.** For the first time in Belarusian science the literature of Belarus of the first half of the XIX century is considered in the aspect of the aesthetic ideal by identifying the main themes, images and forms. The definition of the role of romantic irony is new in the study of this theme.

Justification of the place of spiritual and religious values, historical and patriotic themes, the images of the shliachich, peasant and poet, emotion in the artistic world of literary works.

The role of symbols of a flower, a river, a mound as an aesthetic value in the texts of the period under study is determined. The genres of lullaby and author's fairy tale in the works of Romantic poets, which are little researched in the modern Belarusian literary studies, are revealed.

**Recommendations for use, sphere of application.** The practical significance of the dissertation lies in the fact that its results supplement the idea of the development of Belarusian literature of the first half of the XIX century, and at the same time the substantial-formal code of the national beautiful writing. The presented results can be used in further study of the topic, as well as in teaching activities.